<u>**ТЭРМІНАЛЫ САМААБСЛУГОЎВАННЯ ПА ПРОДАЖЫ ЖЭТОНАЎ**</u>



У Мінскім метрапалітэне на станцыі «Плошча Леніна» (уваход з боку чыгуначнага вакзала) устаноўлены тэрмінал самаабслугоўвання па продажы жэтонаў. У аўтамаце можна набыць жэтоны за наяўны разлік, выканаўшы ўсяго некалькі маніпуляцый, што робіць яго простым у выкарыстанні для пасажыраў. Тэрмінал прымае банкноты наміналам 5, 10, 20 рублёў, а таксама манеты наміналам 5, 10, 20, 50 капеек і 1, 2 рублі. Як і іншыя тэрміналы самаабслугоўвання, устаноўленыя ў горадзе Мінску, наш апарат рэшты не выдае. Для ажыццяўлення пакупкі неабходна ўнесці суму, кратную кошту жэтона. Інструкцыя па карыстанні тэрміналам размешчана на пярэдняй панэлі.




